Мінск, 25 сакавіка 2017 года

Ваша Экселенцыя,

Сардэчна віншую Вас з 25-годдзем з дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Турэцкай Рэспублікай.

За чвэрць стагоддзя мы прайшлі значны шлях станаўлення і развіцця сяброўскіх і раўнапраўных стасункаў, сфарміравалі трывалыя традыцыі супрацоўніцтва, якое будуецца на прынцыпах узаемнага даверу і павагі.

Сёння беларуска-турэцкае ўзаемадзеянне выйшла на якасна новы ўзровень, сведчаннем чаго стаў першы ў гісторыі двухбаковых адносін афіцыйны візіт у Рэспубліку Беларусь кіраўніка Турцыі – Прэзідэнта Турэцкай Рэспублікі Рэджэпа Таіпа Эрдагана.

Рэалізацыя дамоўленасцей, дасягнутых на вышэйшым узроўні, і Плана дзеянняў па развіцці супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Турэцкай Рэспублікай, эфектыўная дзейнасць інстытуцыянальных механізмаў двухбаковых стасункаў, у першую чаргу Беларуска-Турэцкай Сумеснай міжурадавай эканамічнай камісіі, пашырэнне кантактаў паміж органамі дзяржаўнага кіравання і парламентамі нашых краін, актывізацыя міжрэгіянальных і пабрацімскіх сувязей, узаемадзеяння ў навукова-тэхнічнай, культурнай, адукацыйнай галінах, каардынацыя працы ў рамках міжнародных арганізацый – усё гэта, безумоўна, будзе спрыяць далейшаму раскрыццю вялізнага патэнцыяла беларуска-турэцкіх адносін у інтарэсах нашых дзяржаў і народаў.

Прыміце, шаноўны калега, шчырыя пажаданні моцнага здароўя і поспехаў у дыпламатычнай і дзяржаўнай дзейнасці, а таксама запэўненне ў маёй вельмі высокай павазе.

Уладзімір Макей